**Кароткі змест Лірыка**

Зайграй, зайграй, хлопча малы...

Зайграй, зайграй, хлопча малы,

І ў скрыпачку і ў цымбалы,

А я зайграю ў дуду,

Бо ў Крошыне жыць не буду.

Бо ў Крошыне пан сярдзіты,

Бацька кіямі забіты,

Маці тужыць, сястра плача:

«Дзе ж ты пойдзеш, небарача?..»

Дзе ж я пайду? Мілы Божа!

Пайду ў свет, у бездарожжа,

У ваўкалака абярнуся,

З шчасцем на вас азірнуся.

Будзь здарова, маці міла!

Каб ты мяне не радзіла,

Каб ты мяне не карміла,

Шчасліўшая ты бы была!

Каб я каршуном радзіўся,

Я бы без паноў абыўся:

У паншчыну б не пагналі,

У рэкруты б не забралі

І  ў маскалі не аддалі.

Мне  пастушком век не быці,

А  у маскалях трудна жыці,

А  я і расці баюся,

Дзе  ж я, бедны, абярнуся ?

Ой,  кажане, кажане!

Чаму  ж не сеў ты на мяне?

Каб  я большы не падрос

Ды  ад бацькавых калёс.

**Мастацкія  асаблівасці**

«П. Багрым не фантазіраваў, не выдумляў страхаў і болю. Ён бачыў трагедыю роднага сяла і пісаў пра яе, раскрываючы гэтым лес усяго зняволенага беларускага прыгоннага сялянства.

Па сутнасці, верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы...» — верш юнака-падлетка, які ўжо ведаў, што яму ёсць прысуд ісці ў салдаты, калі выйдуць гады...

Шчасцем юнак лічыць не быць чалавекам, быць хоць ваўкалакам, толькі не чалавекам, над якім паншчына, рэкруцтва, салдатчына — адна няволя! Ці ў крайнім выпадку заставацца ўсё жыццё малым пастушком... Адсюль і просьба да кажана, каб ён сеў на хлопчыка, каб малому не расці, не станавіцца дарослым. Бо, па тагачасных уяўленнях беларуса-селяніна, кажан — птушка чарадзейная: сядзе яна на дзіця, дзіця не расце. Радзіцца б каршуном, тады можна было б і не знаць паноў, паншчыны, салдатчыны...»